База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# ЗОРКА АЙЧЫННАГА ДОЙЛІДСТВА

**2 снежня споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння выдатнага беларускага дой-ліда Станіслава Данілавіча Шабунеўскага (1868 — 1937), чыё імя ўключана ва ўсе энцыклапедыі і падручнікі па архітэктуры.**

Родам ён з вёскі Скароднае Мазырскага павета Мінскай губерніі (сёння — Ельскі раён Гомельскай вобласці). Паходзіў са старажытнага шляхецкага роду, які вёў сваю гісторыю ад XVI стагоддзя, але да XIX стагоддзя страціў землеўладанні і заняўся чыноўніцкай службай. Бацька Станіслава быў паштовым служачым.

Сталенне і вучнёўства С. Шабунеўскага прайшло ў Пінску, Бабруйску. Сярэднюю адукацыю Станіслаў атрымаў у знакамітай з 1617 года Слуцкай мужчынскай класічнай гімназіі. Вучыўся на сродкі камітэта дапамогі бедным вучням. Пасля гімназіі — Санкт-Пецярбургскі універсітэт. матэматычны факультэт. Праз год вучобы хлопец вырашыў, што яго жыццё павінна быць аддана архітэктуры. Але вучоба на матэматычным факультэце не прайшла дарма — у большасці збудаванняў майстра адчуваецца імкненне “праверыць алгебрай гармонію”.

У 1891 годзе Шабунеўскі стаў студэнтам Пецярбургскага інстытута грамадзянскіх інжынераў. Яго вучылі знакамітыя архітэктары-практыкі свайго часу Р. А. Гедзіке, І. С. Кітнер, В. А. Шрэтэр. З дыпломам першага разраду Станіслаў быў накіраваны ў 1896 годзе на пасаду інжынера ў будаўнічы аддзел гомельскага ўчастка Лібава-Роменскай чыгункі. Але склалася так, што яго першай значнай работай у Гомелі стаў праект будынка Аляксандраўскай мужчынскай гімназіі (1898), у якім зараз знаходзіцца галоўны вучэбны корпус Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарту. Дарэчы, сёлета гэтаму шыкоўнаму збудаванню, што выканана ў стылі неакласіцызму, спаўняецца 110 гадоў.

С. Шабунеўскаму пашанцавала, што напачатку яго творчай дзейнасці склаліся кантакты з творчай інтэлігенцыяй Гомеля. А вызначальным момантам яго прафесійнай біяграфіі стала падтрымка з боку князёў Паскевічаў — Фёдара Іванавіча і Ірыны Іванаўны. Іх бездакорны густ і інтуіцыя дапамаглі адкрыць у маладым чалавеку вялікае дараванне. С. Шабунеўскаму была прапанавана адказная пасада гарадскога архітэктара г. Гомеля.

А горад імкліва пераўтвараўся з правінцыйнага павятовага мястэчка ў прамыслова-транспартны і культурны цэнтр. Пасля прыходу сюды Лібава-Роменскай і Палескай чыгунаку некалькі разоў вырасла насельніцтва, узніклі новыя раёны, развіваліся банкаўская і сацыяльная сферы. Інтэлект і дасведчанасць Паскевічаў, матэрыяльныя магчымасці гомельскіх купцоў-гіградпрымальнікаў Паляковых, Грошыкавых, Шановічаў, Дамброўскіх, а таксама талент архітэктара Шабунеўскага зрабілі сапраўдную рэвалюцыю, пераўтварылі аблічча горада.

Для Станіслава Данілавіча Гомель быў аб’ектам пастаянных творчых пошукаў. Майстрам створаны эмацыянальна насычаныя, выразныя, буйнамаштабныя архітэктурныя творы, якія па-сапраўднаму ўпрыгожылі горад. Акрамя мужчынскай гімназіі, гэта будынкі аддзялення Арлоўскага (рог вуліц Савецкай-Першамайскай) і Віленскага банкаў (рог вуліц Савецкай-Сялянскай).

Сапраўдным упрыгожаннем Гомеля быў і застаецца асабняк па вуліцы Ірынінскай, 15, у якім зараз Дом грамадзянскіх абрадаў. Як сведчыць дата на фігурным аттыку і ўладальніцкая манаграма ў картушы над галоўным уваходам дома, ён быў пабудаваны для знакамітага гомельскага ўрача Навума Аляксандрава ў 1903 годзе. У стылі

мадэрн выкананы двухпавярховы жылы дом на рагу вуліц Баўмана-Білецкага (раней Баярская-Мільённая). Ен будаваўся ў якасці даходнай маёмасці купца К. П. Грошыкава, дзе жыллё здавалася жадаючым у найм. Для такіх самых мэт існаваў дом, што зараз мае адрас Савецкая, 20 і які вылучаецца на фоне суседніх пабудоў шыкоўнай мадэрнавай ляпнінай.

Больш стрыманы дэкор скарыстаны С. Д. Шабунеўскім у будынках лячэбнага прызначэння: земскай бальніцы і шпіталі. Яны з’явіліся на вуліцы князя Паскевіча падчас Першай сусветнай вайны на сродкі княгіні І.І.Паскевіч. Гэта стары корпус бальніцы хуткай дапамогі і ваенны шпіталь па вуліцы імя Камісарава (зараз ён на рэстаўрацыі).

Шабунеўскі меў вопыт праектавання дамоў у так званым рускім стылі. Сюды можна аднесці Нікольскую царкву Палескай чыгункі (1904 г.), якая пасля рэстаўрацыі ўвайшла ў комплекс аднайменнага мужчынскага манастыра па вуліцы Дз. Беднага; былы клуб запалкавай фабрыкі “Везувій” (1922 г.) — цяпер корпус вытворчага аб'яднання “Гомельдрэў” па вуліцы Севастопальскай, 61.

Пасля рэвалюцыі Шабунеўскі працягваў працаваць архітэктарам, праектуючы не толькі для Гомеля, але і другіх месцаў, галоўным чынам, Клінцоў. Ён узначаліў асушэнне вядомага ў Гомелі “гарэлага балота”. Пад яго кіраўніцтвам у 1920-я гады ішла рэстаўрацыя палаца Паскевічаў пасля пажару ў выніку Стракапытаўскага мяцяжу 1919 года.

Жылыя дамы, якія ўзводзіліся па праектах архітэктара Шабунеўскага ў паслярэвалюцыйны час, адпавядалі канструктывісцкім мастацкім тэндэнцыям. Адным з першых шматпавярховых пабудоў Гомеля з 1927 года быў дом па вуліцы Пушкіна, 26, які меў кватэры секцыйнага тыпу. А самы высокі будынак у даваенным горадзе з’явіўся ў 1931 годзе — шасціпавярховы дом для рабочых паравозавагонарамонтнага завода, так званы Дом-камуна. З рысамі канструктывізму, але ўжо з асобнымі добраўпарадкаванымі кватэрамі, у той самы перыяд пабудаваў С. Д. Шабунеўскі дом па праспекту Леніна, 51. Апошнім рэалізаваным праектам майстра быў будынак на рагу Кірава-Артылерыйскай (што бліжэй да вінзавода).

У лютым 1931 года С. Д. Шабунеўскі быў арыштаваны. Архітэктара абвінавачвалі ў прыналежнасці да праватрацкісцкай контррэвалюцыйнай арганізацыі, у складзе якой ён і іншыя нібыта вялі шкодніцкую дзейнасць у будаўніцтве. Падчас следства Станіслаў Данілавіч не прызнаў сябе вінаватым, але быў асуджаны на 10 гадоў з адбываннем пакарання на Беламорканале. Там ён і памёр у 1937 годзе. Поўнасцю рэабілітаваны праз 52 гады, у 1989-м.

Зробленае майстрам павінна быць дастойна ацэнена землякамі. На нашу думку, ёсць усе падставы назваць імем Станіслава Шабунеўскага адну з вуліц Гомеля, ушанаваць імя архітэктара ў мемарыяльнай дошцы на адным са створаных ім будынкаў. А помнік архітэктару Шабунеўскаму стаў бы данінай павагі чалавеку, які ўнёс значны ўклад у стварэнне аблічча нашага горада.

**Валянціна ЛЕБЕДЗЕВА, выкладчык кафедры беларускай культуры ГДУ імя Ф. Скарыны,**

**Таццяна ЛІТВІНАВА, загадчыца мастацкага аддзела музея Гомельскага палацава-паркавага ансамбля.**

Лебедзева, В. Зорка айчыннага дойлідства: [Станіслаў Шабунеўскі] / Валянціна Лебедзева, Таццяна Літвінава // Гомельская праўда. – 2008. – 4 снежня. – С. 5.